**Клішэвіч Наталля Сяргееўна,**
**Куралові Наталля Сцяпанаўна**
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы
e-mail: ni_center@mail.ru

## «СЦЯНА» Ж.-П. САРТРА І В. БЫКАВА: СІМВАЛЫ ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ

***Анатацыя:*** разглядаюцца асаблівасці індывідуальнай самасвядомасці чалавека ў сітуацыі экзістэнцыяльнага выбару на прыкладзе аднаіменных твораў В. Быкава і Ж.-П. Сартра.

***Ключавыя словы:*** індывідуальная самасвядомасць, свабода выбару, В. Быкаў, Ж.-П. Сартр, экзістэнцыялізм.

**Natallia Klishevich,**
**Natallia Kuralovich**
National Institute for Higher Education
e-mail: ni_center@mail.ru

## «THE WALL» BY J.-P. SARTRE AND V. BYKAU: SYMBOLS OF INDIVIDUAL SELF-CONSCIOUSNESS

***Abstract:*** the peculiarities of individual self-consciousness of a person in a borderline state on the example of the works with the same name by V. Bykau and J.-P. Sartre are considered.

***Keywords:*** individual self-consciousness; freedom of choice; V. Bykau; J.-P. Sartre; existentialism.

Правесці параўнальны аналіз двух твораў натхняюць не толькі цалкам супадаючыя назвы, не толькі паралель паміж французскім і беларускім экзістэнцыялізмам, але і ўсведамленне таго, што творы, напісаныя ў розныя гады (1939 і 1997) у неаднолькавых гістарычных рэаліях, і сёння даюць магчымасць пераасэнсаваць самога сябе, пагрузіцца ў сітуацыю няўхільнага выбару і самавызначэння.

Усведамленне суб’ектам самога сябе – гэта і ўсведамленне станаў свайго цела, і фактаў свядомасці, і сістэмы каштоўнасцей, пераваг і імкненняў. Самасвядомасць – адно з цэнтральных паняццяў класічнай заходняй філасофіі. Гэта ўсведамленне існавання ўласнага Я і станаў свядомасці, якія належаць асобе. Так, напрыклад, паводле Дэкарта, самасвядомасць – адзіныя верагодныя, несумнеўныя веды, якія і з’яўляюцца падставай для ўсёй сістэмы ведаў [3].

Апавяданне Ж.-П. Сартра пачынаецца з рэзкага пераносу ў рэальную стрэсавую сітуацыю арышту: белы пакой, яркае святло, людзі ў цывільным задаюць па крузе пытанні, адказы на якія ім ужо вядомыя, нешта запісваюць. Усё, супрацiўленне бессэнсоўна, наперадзе вынясенне прысуду. Жыццё імгненна распадаецца на дзве часткі: да і пасля арышту. А зараз толькі д'ябальскі холад, атупеласць, у галаве звон. Тры чалавекі ў склепе-камеры за пару гадзін перад расстрэлам ператвараюцца ў тры «абяскроўленых прывіда» [4]. Аўтар пагружае нас у індывідуальную самасвядомасць Пабла Іббіета. Падчас чытання адбываецца нявольнае атаясамленне сябе з ім, чуеш, бачыш, думаеш, перажываеш, як ён. Ацэньваеш тое, што адбываецца, назіраеш за Хуанам і Томам, бачыш, як змяняецца іх фізічны і псіхічны стан пры ўсведамленні канечнасці свайго жыцця.

Хуан, хрупкі хлапчук з дрыготкімі вуснамі, амаль не расплюшчваў рот, «страшна баяўся», быў занадта малады. Ён як быццам нічога не чуў і не бачыў. Перад тварам смерці стаў зямліста-шэрым, стаў здавацца старой развалінай. Ён лічыў сябе ахвярай абставін, бо анархіст не ён, а яго брат Хасэ, ён не хоча расплачвацца за іншага. Яго пачынае скоўваць страх перад фізічнымі пакутамі. Перад расстрэлам ён галасіў, плакаў, паводзіў сябе, як «хворы, які ратуецца ад смяротнай хваробы ліхаманкай» [4]. На расстрэл яго неслі, бо ён не мог стаяць. Свядомасць Хуана раздвоілася: з аднаго боку, ўсведамленне сваёй датычнасці да таго, што адбываецца тут і цяпер, з другога боку, свядомасць цалкам захапіў панічны страх, і ён проста да-існуе апошнія гадзіны свайго жыцця. Цяжар прысуду цалкам раздавіў яго асобу.

Том, наадварот, моцны і нават таўставаты, вялікі аматар пагаварыць. Усведамленне сваёй долі, прызнанне канечнасці свайго быцця рабіла яго дзейсным: спрабуе сагрэцца, падбадзёрвае Хауна. Але чым бліжэй расстрэл, тым глыбей усведамленне таго, што здарылася, тым больш шэрым робіцца яго твар. Гэта ўжо варты жалю, раздаўлены чалавек.

Твары Хуана, Тома і Пабла сталі потнымі і попельна-шэрымі. Яны сталі падобнымі адзін да аднаго, блізкасць смерці дала ім магчымасць адлюстроўваць адзін аднаго. Твар і цела Пабла пакрывае пот, нягледзячы на холад. Цела рэагуе на смяротны страх перад смерцю, а думкі дранцвеюць, накатвае хваля абыякавасці.

На гэтым фоне рэзка кантрастуе фігура лекара-бельгійца, які праводзіць з імі апошнія гадзіны замест святара. Ён як процівага асуджаным на смерць, як уключаны назіральнік, як сімвал працягу жыцця і бессэнсоўнасці перадсмяротнай агоніі трох душ.

Чатыры чалавекі ў адным падвале, чатыры лёсы кантакту са светам і чатыры перажыванні сваёй «закінутасці ў свет». Лекар, як д'ябл разам з тымі, хто асуджаны на смерць: прапануе цыгарэты, спрабуе суцешыць Хуана. Той факт, што Ж.-П. Сартр адпраўляе ў падвал да зняволеных замест святара лекара, выключае магчымасць

зрабіць ім свой выбар перад тварам Бога. Чалавек сам на сам нясе на сваіх плячах цяжар свету і ўсведамлення свайго месца ў ім і як вынік – усведамленне канечнасці свайго быцця. Лекар з цікаўнасцю, якая мяжуе з «мяккім» цынізмам, назірае за асуджанымі на смерць, правярае пульс, робіць запісы ў нататніку. Нам ён становіцца агідным сваёй ветлівай пачцівасцю, сваімі з'едлівымі заўвагамі.

Абмеркаванне тэхнікі расстрэлу і болю дазваляе адчуць боль на фізічным узроўні. Услед за гэтым ідзе перажыванне сваёй аддаленасці ад свету. Усё застанецца ранейшым: падвал, лаўка, газавая лямпа, неба. А чалавека не стане, усё «выслізне, сапсуецца, знікне. Потым нічога не будзе» [4]. Розум аддзяляецца ад цела і намагаецца зірнуць на труп, спрабуе ўсвядоміць, як будзе працягвацца жыццё пасля ўласнай смерці. І чалавек разумее, што ён да гэтага не гатовы. Рана ці позна ўсе будуць стаяць перад мяжой, якая вядзе да выбару, але зразумець, што гэта здарыцца менавіта цяпер, у гэты момант, – да гэтага «гатовым быць папросту немагчыма». «Няўжо я знікну бясследна!» – гэта як крык усведамлення сваёй «закінутасці» і «выпадковасці» у гэтым свеце [4].

Чалавек не хоча, каб яго «прыкончылі, як жывёлу», ён павінен зразумець сутнасць быцця. Раптам свядомасць ярка асвяцілі ўспаміны: усё што ўспрымалася ўсур'ёз, усё «жыццё не каштавала і шэлега, бо яно загадзя не мела сэнсу» [4]. Атрымліваецца, што жыццё – чарнавік, у якім чалавек так нічога і не зразумеў і перапісаць яго наноў немагчыма. Мы асуджаем сябе жыць у свеце бадрыяраўскіх сімулякраў. У гэты момант чалавек нараджаецца як асоба, якая здзяйсняе свой унікальны выбар, і бярэ на сябе адказнасць за сваё жыццё. Тут відавочная сугучнасць філасофіі Ж.-П. Сартра з яго ўсведамленнем чалавека-праекта, які нараджаецца ў часе.

На прыкладзе Тома і Хуана аўтар паказвае працэс адчужанасці ад самога сябе: калі чалавек перастае займаць актыўную пазіцыю, ён ператвараецца ў Нішто, нават калі лёсам яму наканавана зрабіць выбар. Па меркаваннях Ж.-П. Сартра, гэты выбар даравана зрабіць не кожнаму. На прыкладзе Пабла мы назіраем пэўныя этапы трансфармацыі асобы: адчужанасць, асэнсаванне адзіноты, змяненне ўспрыняцця навакольнага асяроддзя, аддаленасць ад ранейшых ідэалаў і прынцыпаў, адчужанасць ад шаблонных паводзін людзей, асэнсаванне сваёй унікальнасці. Паўната «быцця-у-сабе» не сумяшчальная са свабоднай суб'ектыўнасцю «быцця-для-сябе», адсюль і анталагічная раздвоенасць: чалавечая свабода абсалютная, і менавіта ад свабоднага выбару залежаць выхад з раздвоенасці і пераход да трансцэндэнтнасці [2, с. 83–85].

Паступова хаатычны паток думак і свядомасці звужаецца да адной думкі: няма надзеі на неўміручасць: «якая розніца, колькі табе засталося чакаць – некалькі гадзін або некалькі гадоў» [4]. Прыходзіць жудасны спакой і адлучанасць. Выбар зроблены – трэба памерці годна. Калі дваіх павялі на расстрэл, а афіцэр

прапанаваў здаць сябра і застацца жыць, Пабла раптам паглядзеў на тое, што адбываецца, іншымі вачыма: ім, усім наканавана было памерці, праўда пазней, але не нашмат! І сур'ёзная дзелавітасць стала камічнай, усе вакол «выглядалі звар'яцелымі» [4], і нават уласны выбар стаў пацешным. І Іббіета вырашыў давесці забаву да канца, пусціць па ложным следзе. Ён забаўляўся, калі яго гульню прынялі сур'ёзна. Прыемна было ўсведамляць, што апошнія хвіліны жыцця праходзяць па ўласным сцэнарыі, што бязглуздыя пошукі на могілках ні да чаго не прывядуць.

І раптам – адмена расстрэлу. Іббіета пазнае, што Рамона Грыса злавілі. Па іроніі лёсу, той сапраўды вырашыў схавацца на могілках. Так Іббіета са сцэнарыста апошніх хвілін свайго жыцця ператвараецца ў здрадніка і тым самым ратуе сваё жыццё. Сцяна як вобраз «памежнай мяжы», выбудаваны за некалькі гадзін новага светаўспрымання і ўсведамлення сябе сапраўдным і незламаным чалавекам, развалілася. Сцяна як сімвал, які падзяляе жывых і асуджаных да смерці, як сімвал апошняй абароны перад безабароннасцю расстрэлу, рухнула. Узнікла новая «сцяна» бессэнсоўнасці і нікчэмнасці чалавечага існавання.

«Сьцяна» В. Быкава нясе іншую сэнсавую нагрузку: гэта таксама мяжа, якую імкнецца пераадолець чалавек, але яна надзелена рысамі жывой істоты. «Каменная, закапцелая, дужа старая», «сьцюдзёная і цьвярдая» [1], яна адзіная акружае чалавека ў няволі, адзіная побач шмат гадоў. Калі чалавек не можа да канца пазнаць ісціну, ён міжволі пачынае асэнсоўваць яе праз метафару: сцяна як знак мяжы паміж штодзённым жыццём і крытычнай падзеяй; сцяна як знак тупіка, канчатковасці жыцця, які выклікае трывогу, страх; сцяна як знак кантакту чалавека са светам, як лакмусавая паперка, якая прымушае чалавека прыйсці да ўсведамлення сябе і сваёй сітуацыі як быцця ў свеце; сцяна як выява, з якой хочацца зліцца, стаць незаўважаным і пайсці ў вечнасць. Будынак-турма як сімвал дыктатуры, бо «дыктатары ў гэтай кріне не выводзіліся ніколі» [1]. І сцяна, і камень, і вапна, і цэгла – усё сцвярдзелае і нязрушнае.

Надзея выбрацца з турмы на волю, паволі і неўпрыкмет выпростоўваючы камень за камнем са сцяны, стала мэтай і сэнсам жыцця. У першым камяні, што дзёр, калупаў, драпаў і, нарэшце, дастаў са сцяны, «сышліся… усе ягоныя назапашанныя за гады воля і надзея» [1]. Сіл надавалі думкі пра каханую, мары сказаць ёй галоўныя словы пра каханне, пра тое, што не здраднік. З'явілася адчуванне, каб усё павярнуць назад, стаў бы «…у сто разоў лепшы. Сьмялейшы. Разумнейшы» [1]. Вострае адчуванне жыцця да і пасля арышту, адчуванне хуткага магчымага скону і жадання выбрацца адгэтуль, прасачыцца праз сцяну на волю надае сілы і ўпэўненасці ў сабе. Гэта дае магчымасць не здавацца і дзейнічаць, марыць, што адсюль ёсць выйсце. Але за мурам быў толькі новы шэры мур і чорнае неба, шыбеніца з драўляным падмосткам. Выйсця не было: выхад за межы не апраўдаў надзей. Гэта пазбавіла апошняй надзеі-ілюзіі на выратаванне. Чалавек выпадковы ў гэтым

свеце, самотны і бездапаможны. Яго спробы змяніць рэальнасць, зрабіць усвядомлены выбар і самавызначыцца дарэмныя: «Выйсця адсюль не было». Не было сэнсу жыць у турме, няма сэнсу і памерці, «добра б не нарадзіцца зусім» [1]. Але, на жаль, ад чалавека, не залежыць прыход у гэты свет, як не залежыць і само жыццё. Толькі існаванне дае чалавеку магчымасць назапасіць свой унікальны жыццёвы досвед праз усведамленне самога сябе.

Ці абваліцца сцяна, адкрыўшы перад чалавекам новыя гарызонты, ці дасць яму новую волю для самавызначэння, ці стане непераадольнай рысай, якая падагуліць увесь жыццёвы вопыт і прывядзе да ўсведамлення базавай адзіноты чалавека і непарыўнай сувязі жыцця і смерці? Да гэтых разважанняў далучаецца міжволі і чытач, які паглыбляецца ў вобраз героя, і міжволі пачынае спачатку бачыць, а потым і фізічна адчуваць і думаць, як ён, і задумвацца над сваім жыццём у сітуацыі экзістэнцыяльнага выбару. Ці зможа дазволіць сабе чалавек вольна думаць, разважаць і паступаць у сітуацыі, абмежаванай «сцяной», звычкамі, усталяваннасцю бытам і абыякавасцю?

Адрозненне «Сцяны» Ж.-П. Сартра і В. Быкава ў тым, што ў Ж.-П. Сартра чалавек у адзіноце нясе на сваіх плячах цяжар свету, ён «асуджаны быць вольным». Яго вязні не атрымліваюць у асобе лекара ні малітвы, ні Боскай дапамогі. Герой В. Быкава перад тым, як пралезці праз мур, «стаў на калені і перахрысьціўся» [1]. Выбар здзяйсняецца з думкай пра Бога, ёсць надзея на яго дапамогу.

Такім чынам, у сітуацыях маральнага выбару ў чалавека толькі два варыянты: ён альбо застаецца свабодным і адказным, альбо адмаўляецца ад адказнасці, ад права быць самім сабой. У сітуацыі экзістэнцыяльнага выбару ні час, ні месца, ні рознасць нацыянальных характараў і культур не з’яўляюцца рашаючымі фактарамі. Адно толькі мае сэнс – свабода як сімвал індывідуальнай самасвядомасці.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Быкаў, В. Сьцяна / В. Быкаў. – Минск : Наша Ніва, 1997. – 382 с.
2. Клишевич, Н.С. Человек в пограничной ситуации: свобода выбора / Н.С. Клишевич // Философы XX века: Жан Поль Сартр : XI Юбилейн. Респ. Чтения / сост. В.С. Вязовкин. – Минск : РИВШ, 2006. – С. 83–85.
3. Лекторский, В.А. Самосознание [Электронный ресурс] / В.А. Лекторский. – Режим доступа: https://iphlib.ru/library/collection/newphilenc/document/. – Дата доступа: 11.10.2020.
4. Сартр, Ж.-П. Стена : сб. / Ж.-П. Сартр ; пер. с фр. – М. : АСТ, 2015. – 285 с.